Вы зрабілі перадаплату за нумары «Народнай волі» ў другой палове 2008 года?
Не спазніцеся!

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

№№95–96
(2823–2824)

27 чэрвеня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія — па тэлефоне 328-68-71.

«Справу палкоўнікаў» разглядае Вярхоўны суд

"Справу палкоўнікаў" разглядае Ваенная калегія Вярхоўнага суда Беларусі. На лаве падсудных — былыя начальнік упраўлення па барацьбе з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй КДБ **Міхаіл Міхалап** і начальнік кадравай і ідэалагічнай працы КДБ **Аляксандр Мяцеліца**.

Супраць іх вылучаны цэлы спіс абвінавачванняў, у тым ліку падбухторванне да дачы хабару, махлярства і незаконнае захоўванне боепрыпасаў. Па версіі следчых, палкоўнікі дзяржбяспекі неаднаразова атрымлівалі ад кіраўнікоў камерцыйных структур хабар і розныя "падарункі". Абвінавачваныя прызнаюць сваю віну толькі ў захоўванні патронаў.

Расійскім міністрам не спадабалася беларускае малако

Расія плануе абмежаваць увоз сухога малака з Беларусі. З такімі прапановамі выступілі расійскія міністэрствы эканамразвіцця і сельскай гаспадаркі.

Як паведамляе РИА "Новости", цяпер рыхтуюцца "прапановы па аператыўных мерах рэгулявання імпарту, найперш сухога малака, якое пастаўляецца з Рэспублікі Беларусь".

ЗАДУМАЙЦЕСЯ!

Толькі восем абітурыентаў правільна адказалі на ўсе пытанні па беларускай мове

Пра гэта паведаміў дырэктар Рэспубліканскага інстытута кантролю ведаў Мінадукацыі Мікалай Фяськоў. Пры гэтам ён зазначыў, што ў гэтым годзе тэставыя заданні былі значна лягчэйшымі. І ўсё ж вышэйшы бал атрымалі толькі 8 чалавек з больш чым 68 тысячаў абітурыентаў.

Пра што сведчаць гэтыя лічбы? Не, не дурныя нашы дзеці. Хутчэй за ўсё прычына ў іншым — існуючая сістэма адукацыі ў краіне, палітыка ўлад звялі на нішто глыбокае авалодванне роднай мовай у нашых школах.

Такое нецярпімае становішча — ганьба і сорам для нас усіх, для Беларусі.

І гэта — XXI стагоддзе, цэнтр Еўропы?

Мінюст не разумее

Днямі аргкамітэт па стварэнні Беларускай хрысціянскай дэмакратыі атрымаў ліст ад Міністэрства юстыцыі, дзе грамадскаму аб'яднанню адмаўляецца ў рэгістрацыі. Мінюст спасылаецца на тое, што яму застаюцца незразумелымі "мэты, задачы, прадмет і метады дзейнасці арганізацыі".

Гэта ўжо другая спроба зарэгістраваць БХД, першая адмова прыйшла яшчэ ў снежні. Тады міністэрства спасылалася на тое, што заяўнікі не патлумачылі ў статуце арганізацыі сутнасць хрысціянскіх каштоўнасцяў, а таксама як БХД будзе іх адстойваць.

Другое асваенне Пінщчыны

У Пінскім універсітэце адкрыюць факультэт біятэхналогій. З гэтай мэтай ВНУ аддалі сельскагаспадарчыя землі, якія раней належалі кааператыву "Почапава".

"На землях "Почапава" змесцяцца батанічны сад, аранжарэі з экзатычнымі раслінамі, цяпліцы для гародніны, інкубатар для вывядзення малькоў рэдкіх прэснаводных рыб. ку Пінска.

Выбары дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі прызначаны на 28 верасня 2008 года

Адпаведны ўказ № 344 "Аб прызначэнні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь чацвёртага склікання" 24 чэрвеня падпісаў кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Аб гэтым паведаміла прэс-служба прэзідэнта. У гэты ж дзень кіраўнік дзяржавы выдаў указ, згодна з якім выбары ў Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу чацвёртага склікання назначаны на перыяд з 14 ліпеня па 14 кастрычніка 2008 года.

Дарэчы, 28 верасня — гэта свята гусятнікаў, дзень масавага адлёту дзікіх гусей і качак на поўдзень.

Лідзія Ярмошына ўсё ведае наперад

Старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія Ярмошына прагназуе высокую яўку выбаршчыкаў на парламенцкіх выбарах 2008 года. Пра гэта яна заявіла ў інтэрв'ю БелаПАН.

На думку Л.Ярмошынай, на вынікі выбараў не паўплывае адмена сацыяльных ільгот і гарантый, якая адбылася ў 2007 годзе.

"Хто сказаў, што льготы адназначна падтрымліваюцца і вітаюцца ўсім насельніцтвам? Паверце, тая частка насельніцтва, якая льготамі не карыстаецца, адмоўна ставілася да іх наяўнасці ў іншых грамадзян, — сказала кіраўнік ЦВК. — Апрача таго, многія грамадзяне льготамі і не карысталіся. Узяць супрацоўнікаў праваахоўных органаў: ім належаў ільготны праезд, але большая іх частка ездзіць на ўласных машынах і ўжо даўно не карыстаецца нічым бясплатным. Структура льготаў, якая была раней, ужо ўстарэла. Яе ў любым выпадку трэба было пераглядаць. Калі немалая частка студэнцтва ездзіць на лекцыі на ўласных машынах, аб ільготным праездзе на электрычках неяк і няёмка казаць".

Кіраўнік Цэнтрвыбаркама таксама паведаміла, што, згодна з праведзеным зімой апытаннем, прыйсці на парламенцкія выбары збіраліся 60% выбаршчыкаў, 25% рэспандэнтаў заявілі, што, "хутчэй за ўсё", прыйдуць.

"Такім чынам, 85% — гэта патэнцыял, які трэба не змяншаць, а працаваць над яго павелічэннем", — заявіла Л.Ярмошына.

Дэмакраты — хто куды

Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы выступаюць са спісам 110-ці

"Я не ўпэўнены, што адбудуцца нейкія дэмакратычныя змены ў паводзінах улады. Таму гэта будзе жорсткая палітычная кампанія. Яна можа быць больш жорсткая, чым кампанія 2004 года. Поўны комплекс дзеянняў: ціск, зняцце, нядопуск да агітацыі, неўключэнне ў камісіі і пазбаўленне рэгістрацыі", — заявіў кіраўнік Партыі камуністаў Беларускай **Сяргей Калякін**.

"Самае галоўнае ў любой палітычнай кампаніі — гэта барацьба за думкі і душы грамадзян. Таму нават калі няма выбараў, гэта ўдзячная праца", — зазначыў С.Калякін, адказваючы на пытанне, ці мае сэнс удзельнічаць у парламенцкіх выбарах.

"Ці атрымаем мы мандаты — гэта другаснае пытанне", — кажа палітык і прагназуе вынікі выбарчай кампаніі: "Я так мяркую, што мандатаў не будзе".

Разам з тым кіраўнік ПКБ кажа: "Калі сёлета і будуць дапушчаны да мандатаў людзі — гэта будуць людзі з адзінага спісу. Інакш ніякага сэнсу няма. У гэтыя гульні ніхто гуляць не будзе, на Захадзе ніхто не прызнае вынікі выбараў. Таму ўсё будзе залежаць ад таго, як добра мы зрабілі спіс адзіных кандыдатаў".

"Я не бачу іншых калон. Пакуль я бачу толькі адзіны спіс, усё астатняе — гэта толькі размовы пра тое, што нешта ёсць. Пакуль існуе толькі агульны спіс аб'яднаных дэмакратычных сіл", — заяўляе Сяргей Калякін.

Аднак ён не выключае, што ў выбарах будуць удзельнічаць і кандыдаты, якія не ўваходзяць у агульны спіс: "Магчыма, нехта паспрабуе, альбо некага прымусяць, каб яны разбавілі адзіны спіс. Адзіны спіс не забараняе нікому ўдзельнічаць у выбарах — кожны грамадзянін мае права вылучыцца і ўзяць удзел у выбарчай кампаніі".

"Еўрапейская кааліцыя" вылучае сваіх кандыдатаў

Адзін з лідэраў незарэгістраванай "Еўрапейскай кааліцыі" старшыня аргкамітэта Партыі свабоды і прагрэсу Уладзімір Навасяд паведаміў, што спіс кандыдатаў ад кааліцыі ўжо ўзгоднены.

"У ім каля 70 кандыдатаў з усіх абласцей Беларусі. Такім чынам у рамках "Еўрапейскай кааліцыі" мы вядзём падрыхтоўку да выбарчай кампаніі, якая ўжо па сутнасці пачалася. У гэты спіс кандыдатаў увайшлі сябры аргкамітэта па стварэнні Партыі свабоды і прагрэсу, сацыял-дэмакраты Міколы Статкевіча, асобныя кандыдаты ад незарэгістраванага "Маладога фронту", які як арганізацыя байкатуе выбары, і прадпрымальнікі".

Саннікаў і кампанія — за байкот

На некаторых сайтах з'явілася інфармацыя: "Аб сваім намеры ўдзельнічаць у выбарах абвясціла грамадзянская кампанія "Еўрапейская Беларусь". Гэтыя паведамленні пракаментаваў адзін з лідэраў кампаніі Андрэй Саннікаў.

— Мэтай грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь" з'яўляецца прасоўванне еўрапейскіх каштоўнасцяў у нашай краіне і збор подпісаў грамадзян Беларусі за ўступ у Еўрапейскі Саюз. Удзел або няўдзел у выбарах суб'екты грамадзянскай кампаніі вызначаюць самастойна. Большасць актыўных удзельнікаў грамадзянскай кампаніі "Еўрапейская Беларусь" выказалася за байкот "выбараў", што маюць адбыцца, паколькі пры існуючым рэжыме ў краіне няма ніякіх умоў для больш-менш празрыстых і сумленных выбарчых працэсаў.

Пад нумарам «адзін»

Першы намеснік старшыні Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада) Анатоль Ляўковіч будзе вылучацца па выбарчай акрузе №1.

У спісе кандыдатаў ад Аб'яднаных дэмакратычных сіл ён таксама значыцца пад №1. "Гэтая выбарчая кампанія будзе адрозніваццца ад папярэдняй. Калі праводзілася папярэдняя кампанія, не было створана адзінага спісу, ёсць цяпер і спіс нашых прадстаўнікоў, якіх мы будзем вылучаць у выбарчыя камісіі. Яшчэ адна розніца: па кандыдатах з адзінага спісу будуць больш паліць, чым па кандыдатах-адзіночках. Яны ўяўляюць большую пагрозу для рэжыму і ўлады, чым адзіночкі -- я іх называю: "качкі, якія сядзяць самі па сабе", -- заявіў Анатоль Ляўковіч.

Адказваючы на пытанне, колькі дэмакратычных кандыдатаў пройдзе ў Палату прадстаўнікоў, спадар Ляўковіч заявіў: "Я не хачу рабіць прагнозаў, але калі гэта і здарыцца -- гэта будзе вынік палітычнага торгу. Лукашэнку патрэбны выхад на Захад, і ён можа таргавацца. Але ў любым разе вынікі выбараў не будуць дэмакратычнымі".

Іх лёс хвалюе Беларусь!

Юрый Захаранка
знік 3264 дні таму

Віктар Ганчар
знік 3135 дзён таму

Анатоль Красоўскі
знік 3135 дзён таму

Дзмітрый Завадскі
знік 2848 дзён таму

Аляксандр Казулін
за кратамі 805 дзён

Андрэй Кім
за кратамі 157 дзён

Сяргей Парсюкевіч
за кратамі 115 дзён

Загадкавы выбух пад Мінскам

Магутны выбух стаў прычынай разбурэння будынка былога камбікормавага завода пад Мінскам.

Спецыялісты называюць здарэнне загадкавым, бо ў памяшканні не магло быць рэчываў, якія здольныя выклікаць такую дэтанацыю. На шчасце, ніхто з людзей не пацярпеў. Аднак у выніку выбуху былі пашкоджаны дахі некалькіх дамоў.

Раней у будынку было невялікае прадпрыемства "Вясёлка", пасля яго закрыцця памяшканні здавалі ў арэнду некалькім фірмам, у дзейнасці якіх нічога "выбуханебяспечнага" не было пазначана. Яны займаліся вытворчасцю блокаў, фасадаў. Не мог выбухнуць і газ, бо ён не быў падведзены да будынка. Цяпер праваахоўнікі спрабуюць разгадаць таямніцу выбуху.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 ЧЭРВЕНЯ 2008 г.

АСОБА

БНФавец-ардэнаносец

У прадстаўленні беларускіх дзяржаўных прапагандыстаў бээнэфаўцы — гэта не людзі, а нейкія пачвары, адшчапенцы, якія вельмі далёкія ад простага народа, іх хваляванняў і праблем.

84-гадовы бабруйчанін Міхаіл Аляксандравіч МЕЗЯК — не проста БНЭэфавец, а, можна скажаць, адзін са старэйшыэ бэнээфаўцаў. Ці падыходзіць да яго ярлык платных трубадураў?

М.А.Мезяк — чалавек, які прайшоў вайну, суровую школу жыцця, да пенсіі працаваў у органах Міністэрства ўнутраных спраў. Быў удзельнікам яшчэ І з'езда Беларускага Народнага Фронту, які праходзіў у Вільнюсе, і да гэтага часу застаецца сябрам Партыі БНФ. На грудзях у Міхаіла Аляксандравіча баявыя ўзнагароды заўсёды месцяцца побач з бел-чырвона-белым значком…

"Сам я родам з Заходняй Беларусі, з Баранавіцкага раёна, — кажа мой суразмоўца. — Нарадзіўся на хутары, скончыў сямігодку і гімназію князя Радзівіла ў Нясвіжы. Там было тры мужчынскія факультэты — юрыдычны, эканамічны і тэхналагічны. Я выбраў першую спецыяльнасць. Пасля заканчэння паступіў у каледж у Варшаве, дзе мяне і застала вайна. Аднойчы ў Беластоку сустракаю свайго сябра па хутары, той кажа мне: "Тваіх жа ўсіх раскулачылі і адправілі на Салаўкі". Рабіць няма чаго — трэба было некуды падавацца. Сябра пайшоў на Захад, я — на Усход. Па дарозе сустрэў чатырох палякаў-маракоў, якія забралі мой пашпарт. Што рабіць? Вырашыў рушыць у Мінск. Прыехаў сюды, пахадзіў па горадзе... Пасля сеў на "паражняк" і паехаў у Смаленск. Вайна ўжо ішла поўным ходам..."

Многія людзі беглі ад вайны, а Міхаіл Мезяк вырашыў на вайну ісці. Патрапіў у Маскву, адкуль яго і накіравалі ў 7-ю танкавую брыгаду. Калінінскі, Бранскі франты... З апошняга знялі — і ў Растоў.

— Там мы сфарміраваліся ў корпус, — успамінае Міхаіл Аляксандравіч. — Памятаю маршкідок па снезе з танкамі. Уступаем у бой і выбіваем немцаў з Калача, што на Доне, у 60 кіламетрах ад Сталінграда. Далі нам тры дні адпачыць, а затым загадалі ўзяць раённы цэнтр Чыр. Танкісты не баяцца фронту, але не любяць вулічных баёў, бо не ведаюць, адкуль па іх ударацъ. Так і здарылася з нашым танкам — патрапілі акурат у бак з гаручым. Я экіпаж спусціў праз люк уніз, а сам выскокваў праз башню ды патрапіў пад агонь. Раненне, кантузія, двое сутак ляжаў пад снегам. На мне былі ватнік, буркі, неяк выжыў... Знайшлі, адвезлі на самалёце аж у Баку. Тры месяцы праляжаў у шпіталі, пасля — ізноў на фронт.

У 1945-м вайна для Міхаіла Аляксандравіча скончылася. З арміяй у верасні прыйшоў у Бабруйск, ды лёсам было наканавана патрапіць у Забайкалле, дзе Міхаіл Мезяк і адпрацаваў трынаццаць гадоў юрыстам. Затым яго накіравалі ў Маскву на вучобу...

— Вучыцца там не стаў, — распавядае ён. — Падумалася, што лепш паеду ў сваю родную Беларусь, дзе мне прапанавалі працу на выбар адразу ў трох беларускіх гарадах. Выбраў Бабруйск, у які і прыйшоў пасля вайны з арміяй, да пенсіі працаваў там у органах МУС. Уступіў у Партыю БНФ, быў яшчэ на І з'ездзе Беларускага Народнага Фронту ў Вільнюсе. Зараз у Бабруйску актыўна працую, мы стварылі незалежны прафсаюз чатырох рынкаў. З цяжкасцю ўсё распачыналася, нават прадпрымальнікі спачатку ставіліся да мяне з недаверам. Але я, як мог, змагаўся і змагаюся за іх правы. Зараз мы вось вылучаем кандыдатуру нашага мясцовага гісторыка Міхаіла Чыгіра на выбары ў Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу.

— Міхаіл Аляксандравіч, а хто з лідэраў сённяшняй апазіцыі вам імпануе?

— Пакуль ніхто, акрамя страшыні Партыі БНФ Лявона Баршчэўскага. Няма энергічнасці ў нашых лідэраў. Калі чалавек стаў на гэты шлях, то ён павінен працаваць з народам. Вось, напрыклад, не ляжыць у мяне душа да Аляксандра Мілінкевіча — і ўсё тут. Чалавек ездзіць па замежжы, а вось я не чуў, каб яго на тачцы, як некалі Валенсу, вывозілі за прахадную завода ці фабрыкі. І потым, спадар Мілінкевіч быў адзіным кандыдатам ад Аб'яднаных дэмакратычных сіл, але затым пачаў актыўна ствараць рух "За свабоду". Навошта гэта? Ты замацоўвай АДС, працуй на гэтую структуру. Вылучылі ж яго Аб'яднаныя дэмакратычныя сілы...

— Ці ведаюць Аляксандра Мілінкевіча на бабруйскіх фабрыках, заводах?

— Не ведаюць, бо ён з імі не сустракаецца. Праўда, ёсць у Бабруйску некалькі чалавек, якія стаяць за Мілінкевіча, але ж гэта мізер. Чарнавая работа патрэбна, а не яе імітацыя.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

СТАЛІЦА

Гардскія ўлады далі на беднасць

Рашэнне аб прадастаўленні сацыяльнай падтрымкі шэрагу катэгорый грамадзян — ветэранам працы, інвалідам і малазабяспечаным грамадзянам — прынята на 10-й сесіі Мінгарсавета.

Так, прадугледжана ўстаноўка індывідуальных прыбораў уліку расходу вады адзінокім непрацуючым непрацаздольным грамадзянам за кошт сродкаў гарадскога бюджэту.

Таксама прадугледжваецца аплата аднаўленчага курса лячэння ў РУП "Беларускі пратэзна-артапедычны цэнтр" для інвалідаў-калясачнікаў, якія маюць І групу інваліднасці з захаваным самаабслугоўваннем ва ўмовах безбар'ернага асяродку.

Апрача таго, Мінгарсавет прыняў рашэнне аб пакрыцці фактычных затрат на выраб і рамонт зубных пратэзаў непрацуючым ветэранам працы, якія сталі на ўлік у дзяржаўных лячэбных установах да 17 снежня 2007 года і не пачалі пратэзаванне да згаданай даты, а таксама атрымліваюць пенсію па лініі органаў сацыяльнай абароны, памер якой складае 120% бюджэту пражытачнага мінімуму (БПМ).

Бясплатнае харчаванне прадастаўляецца непрацуючым адзінокім грамадзянам і грамадзянам, якія пражываюць адзінока з ліку інвалідаў І і ІІ груп, памер пенсій якіх не перавышае 100% БПМ, а таксама пенсіянерам і сямейным парам пенсійнага ўзросту, памер пенсій якіх не перавышае 100% БПМ.

Марына НОСАВА.

У Мінску будзе даплата да акладаў

Работнікам бюджэтных устаноў адукацыі, фізкультуры і спорту Мінска ўстаноўлена штомесячная даплата да акладу. Такое рашэнне прынялі дэпутаты Мінскага гарадскога савета 18 чэрвеня.

З 1 чэрвеня па 31 жніўня ўстаноўлена штомесячная даплата да службовых акладаў выхавацеляў, памочнікаў выхавацеляў дзіцячых дашкольных устаноў, якія фінансуюцца з бюджэту Мінска, у памеры трох і адной базавай велічыні адпаведна (базавая велічыня, нагадаем, складае 35 тыс. рублёў).

З 1 верасня 2008 года па 31 мая 2009 года ўстанаўліваецца штомесячная даплата да службовых акладаў работнікаў бюджэтных устаноў адукацыі, фізічнай культуры і спорту: у памеры трох базавых велічынь -- педагагічных работнікаў і работнікаў фізкультуры і спорту; 1,5 базавай велічыні -- загадчыкаў бібліятэк, бібліятэкараў, памочнікаў выхавацеляў.

Усе даплаты, што прадугледжаны гэтым рашэннем, выплачваюцца па асноўным месцы працы за фактычна адпрацаваны час.

Марына НОСАВА.

ПАДЛІЧЫЛІ

Самыя нізкія цэны на прадукты харчавання ў Верхнядзвінску, Шчучыне і Ашмянах

Цэны на прадукты харчавання па рэгіёнах Беларусі досыць значна адрозніваюцца.

Так, сярэдняя цана на ялавічыну першай катэгорыі на канец мая гэтага года склала 9102 рублі за кілаграм і вагалася ад 6980—8270 рублёў у Пінску, Оршы, Наваполацку, Лідзе да 9260—10.170 рублёў у Віцебску, Мінску, Магілёве, Бабруйску.

Як паведамляе Міністэрства статыстыкі і аналізу, самыя нізкія цэны на свініну былі ў Верхнядзвінску, Ваўкавыску, Шчучыне, Клімавічах. Самыя высокія — у Пінску, Наваполацку, Мінску, Беразіне, Бабруйску (9900—12.000 рублёў за 1 кг).

Увогуле самыя нізкія цэны на асноўныя прадукты харчавання ў маі былі ў Верхнядзвінску, Шчучыне, Стоўбцах, Клімавічах, Ашмянах, а самыя высокія — у Мінску, Магілёве, Бабруйску, Барысаве, Пінску.

ДЫПКУР'ЕР

На заходнім фронце — без перамен

Як паведамілі карэспандэнту "Народнай волі" ў прэс-службе Пасольства ЗША ў Беларусі, напрыканцы гэтага месяца ў беларускую сталіцу вяртаецца з адпачынку Часовы Павераны ў справах ЗША ў Мінску Джонатан Мур.

Тым часам нядаўна пасол ЗША ў Беларусі Карэн Сцюарт у інтэрв'ю агенцтву France Press заявіла, што "мы ўсё яшчэ жадаем і гатовы разгледзець спосабы паляпшэння адносін, але ўсё залежыць ад тых крокаў, якія ўлады Беларусі распачнуць у стаўленні да правоў чалавека, якія ляжаць у аснове нашых санкцый. Мы жадаем вызвалення зняволеных і спрабуем прадбачыць, што можа адбыцца на выбарах".

У прэс-службе Міністэрства замежных спраў Беларусі інфармацыяй аб паляпшэнні дыпламатычных адносін паміж ЗША і Беларуссю не валодаюць. "Усё, што МЗС хацела сказаць, намі ўжо агучана", — кажуць там.

Дарэчы, па паведамленні агенцтва "Інтэрфакс", Пасольства ЗША ў Мінску, якое прыпыніла выдачу віз з-за скарачэння штату пасольства, не зможа ў бліжэйшым будучым узнавіць гэтую працэдуру. А значыцца, што беларусы, якія вырашылі наведаць ЗША, вымушаны афармляць візы ў іншых краінах. Найбольш зручнымі месцамі для афармлення віз у ЗША з'яўляюцца Кіеў і Масква, паколькі ў гэтыя краіны не патрэбна віза.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

НЕЗЛОБИВЫЕ ЗАМЕТКИ

Семен БУКЧИН

Удавка для журналистов

I

Что законотворчество в Беларуси носит в основном запретительный, ограничительный и карательный характер не новость. Давить, запрещать, ограничивать — любимейшее занятие белорусских законодателей. И как они любят состязаться в этом святом для них деле.

Один подготовил проект — кажется, уже ни глотка вольного воздуха гражданам не осталось. Ан нет! Встает его ретивый собрат и заявляет:

— Что-то вы, Иван Иванович, нынче либеральничаете! А ведь можно еще вот в этом месте подкрутить, гаечки подзажать!

И подкручивают, подзажимают, соревнуясь между собой и при этом преданно оглядываясь на Хозяина. Так хочется заслужить благосклонный кивок... Мол, хорошо служишь, стараешься. Вижу это, постараюсь не забыть! Получивший такой знак внимания парламентарий радостно взвизгивает и с еще большим усердием принимается служить.

Предметом особого сладострастия для наших законников является борьба со свободным словом, с независимой прессой. Казалось бы, ну что здесь нового можно придумать после уже состоявшегося почти полного ее разгрома?Но в том-то и дело, что почти... Кого разорили, кого закрыли, кого втихую придушили... А кого, не лишив лицензии, выгнали из отечественных типографий, принудив печататься за границей, да еще и нормальной подписки лишили и продажи в киосках "Белсоюзпечати". В общем, хорошо, можно даже сказать, замечательно поработала власть.

Но, видимо, осталось какое-то чувство неудовлетворенности. Душишь-душишь эту независимую прессу, а она, проклятая, все еще жива! Хрипит уже, вроде предсмертные звуки испускает, но потом оказывается — дышит еще негодная! Потому, наверное, и решено было нанести окончательный удар. Разумеется, как принято в известной среде, с контрольным выстрелом в голову. Чтоб уж наверняка.

II

Во втором чтении принят проект закона о средствах массовой информации. Тем самым начат последний акт уничтожения независимой белорусской прессы. Она и до того, можно сказать, влачила... И вот худую и бедно одетую девушку ставят к стене. Перед ней расстрельная команда. Командует акцией большой гуманист, председатель комиссии по правам человека, национальным отношениям и средствам массовой информации Палаты представителей г-н Кулаковский. В помощниках — не менее активная поборница гуманистических идеалов и защитница свободной прессы, заместитель министра информации г-жа Ананич, известный любитель свободного слова, директор Информационно-аналитического центра при Администрации президента г-н Пролесковский и другие светлые личности, чьи имена, безусловно, войдут в историю современной белорусской печати. Раздается стопроцентно убойная автоматная очередь:

— за участие "иностранного капитала"...

— за финансирование из-за рубежа...

— за "самовольный" интернет...

— за... за... за...

III

Впрочем, не исключено, что перед расстрелом еще придется помучиться. А потому не забыто и любимое пыточное орудие — так называемая ответственность за *"распространение недостоверной информации, которая может причинить вред государственным и общественным интересам"*.

О, этот пресловутый безразмерный вред, понятие коего границ не имеет! Критикуешь высокопоставленного чиновника, а он тебе иск через суд: мол, критикой этой причиняется вред государственным интересам, поскольку подрывается авторитет власти. И все дела! Плати штраф, садись в тюрьму. А можно и газету после двух предупреждений прикрыть. Это уж как они, господа воли и живота нашего, решат.

Ну и, безусловно, невозможно обойтись без другой излюбленной "игрушки", вызывающей нервную судорогу у любого частного издателя, — "перерегистрации"? Раз новый закон, то как же не провести очередную перерегистрацию? Не только денежки в очередной раз соберем за ничто, но и построим всех этих независимых писак, поглядим, как они трястись будут... И не зря трясучка их охватит, потому что не все, ой не все пройдут через наше сито, эту самую перерегистрацию. Даром что ли новый закон о печати принимается!

Но не исключено, что некоторые сумеют все-таки прорваться. Потому и предусмотрен тот самый контрольный выстрел в голову. Давно уже власть хотела, что называется, поставить вопрос "рубам": а почему, собственно, да на каком основании являются какие-то люди и пишут, называют себя журналистами? Положим, имеется у них диплом журфака. Но есть ли самое главное — разрешение от государства (читай: от чиновников) писать и печататься?

И вот, судя по всему, наступает решение проблемы. Для начала предложено разобраться с пишущими в иностранных изданиях. В проекте закона прописано, что журналист может работать в иностранном средстве массовой информации, только имея государственную аккредитацию, что будет подтверждаться выдачей соответствующего удостоверения. Нет удостоверения — гуляй, Вася, никакой ты не журналист, хотя и можешь предъявить кучу разных публикаций в самых известных изданиях.

Может быть, речь идет только об аккредитации, связанной с деятельностью корреспондентского пункта какой-то газеты или телеканала? Но в том-то и дело, что в проекте закона говорится вообще о сотрудничестве журналиста в иностранном СМИ. Тут-то и обнаруживается со всей очевидностью стремление государства регулировать профессиональную принадлежность. Говоря точнее, речь следует вести о закамуфлированном запрете на профессию. Ведь как журналист может выступать в печати не только человек, состоящий в штате какого-то издания, но и любой автор, литератор, писатель. Никакого специального разрешения для того, чтобы печататься где угодно, даже по белорусским законам не требуется. Но вот, согласно новой законодательной инициативе, получается, что если я, к примеру, без всякой аккредитации опубликую в испанской "Эль Паис" или в польской "Газете Выборчей" цикл очерков о жизни современной Беларуси, то, выходит, нарушу закон. А уж если буду годами без той же аккредитации в белорусском МИДе сотрудничать с этими газетами, то тем более стану злостным преступником.

Наверное, должны будут считаться таковыми и авторы, печатающиеся в российской периодике. Но ведь у нас Союзное государство! — заметит кто-то. А это, господа хорошие, как посмотреть. Если нам по дешевке нужны газ и нефть российские, тогда мы Союзное государство. А вот что касается российских СМИ, то здесь мы не церемонимся. Не понравилось власти нашей, что и как пишут о Беларуси ведущие российские издания, их, как и своих "нежелательных", турнули из той же подписки и продажи. А за немногими оставленными у нас российскими телеканалами присматривают назначенные для того белорусские каналы, так сказать, просеивают, контролируют, чтобы не проскочило нечто нежелательное.

IV

До чего же неистово желание власти контролировать все и вся. Любопытно, однако, как пойдет процесс далее. Сотни белорусских авторов печатаются в разнообразных зарубежных изданиях. Кто будет определять, осуществляют они журналистскую деятельность или выступают как "чистые" литераторы? Тем более что во многих случаях грань между журналистикой и литературой весьма условна. Но ежели очень хочется и больше нечем заняться, то, разумеется, почему бы и не влезть и не покомандовать в делах журналистско-литературных, творческих? Ведь так хочется приструнить этих писак, этих журналюг, литераторов. Так хочется огосударствить, подчинить бюрократическому диктату любое творчество.

Имея в виду последнее обстоятельство, можно поразмышлять о своего рода экстраполяции идеи аккредитации и выдачи удостоверений не только лицам, сотрудничающим в зарубежных СМИ. В самом деле, а почему бы в новом законе не предусмотреть вообще аккредитацию всех пишущих и печатающихся в Беларуси. Конечно, по сути это будет регистрация потенциально неблагонадежных, поскольку пишущие люди — это большей частью неблагонадежные. И выданное удостоверение будет являться не столько свидетельством благонадежности, сколько документом, разрешающим зарабатывать на хлеб именно таким образом. А отберут удостоверение — ну и подыхай с голоду. Поскольку ты уже не журналист и не писатель, а так, неизвестно кто, если не бомж, то бомз — лицо без определенных занятий. Такого и в тюрягу и в психушку засадить без проблем можно.

Идея эта — огосударствить, ограничить бюрократическими рамками, по сути подчинить свободное слово — имеет на наших просторах давнюю историю. В фельетоне, приуроченном к 200-летию российской печати (а было это в 1902 г.), знаменитейший публицист Влас Дорошевич предлагал учредить форму для журналистов:

"Установлением формы разрешится одно из крупных недоразумений русской общественной жизни, называемое "писаками", "бумагомараками", "борзописцами" и иными переводными французского слова:

— Журналист!

С установлением формы для журналистов, самый вопрос: "на каком основании вы позволяете себе писать", — станет даже глупым.

— Пишет, — согласно присвоенному ему мундиру".

Таким мундиром виделись Дорошевичу шаровары черного сукна, кафтан и баранья шапка с надписью "Ж". С учетом новых времен можно, конечно, форму модернизировать. И непременно разделить государственную и независимую прессу. На служебной фуражке, скажем, у независимых журналистов будет буква "Н", а у государственных "Г". В последнем случае никакого, кстати, оскорбительного намека... Второе столетие пошло со времени предложения Власа Дорошевича о форме для журналистов, а оно по-прежнему остается актуальным. Только, пожалуй, уже не о форме, а об удавке для журналистов следует говорить.

V

В дореволюционные времена при Министерстве внутренних дел Российской империи полуофициально существовал так называемый Рептильный фонд. Это были деньги, предназначенные для подкупа тех или иных изданий. Разумеется, операции такие совершались без огласки. В наше время широчайшей демократии и гласности нет причин стесняться. Опубликованы цифры: почти 122 миллиарда рублей выделены Белорусскому телевидению и радио в 2008 г. из средств бюджета, а всего на поддержку СМИ предназначено около 160 миллиардов рублей. Такие вот неслабые денежки из нашего вами кармана идут на содержание угодной власти прессы.

Говорить ли о ее качестве? Содержанка — она и есть содержанка. Выполняет то, что прикажут. Правда, при этом щедро использует макияж. Сейчас в большой моде мещанский речевой оборот "как бы". У нас многое стало не всамделишным, а "как бы". Вот и пресса, находящаяся на содержании, она ведь и не пресса, а только "как бы".

Масса государственных газет, печатающихся в Минске и по всей стране, — это по сути своей газеты-имитаторы. Имитируют все: и как бы аналитику, внутреннюю и внешнюю, и как бы информацию, и даже как бы полемику могут изобразить в отдельных случаях... И только в единственном случае, когда нужно выступить против критиков режима, тут они выступают в своем истинном — охранительском — амплуа.

Нужны ли обществу, стране такая пресса, такое телевидение, избегающие серьезной проблематики, утаивающие и искажающие правду о происходящем в стране, имитирующие дискуссионность, не предоставляющие слова оппонентам власти и более того зачисляющие их во "враги народа? Тем, кто сегодня у власти, кажется, что держа под строгим присмотром и на содержании прессу, они управляют мозгами граждан и таким образом гарантируют свою стабильность. Что ж, КПСС тоже управляла... Но очередным временщикам кажется, что они умнее своих предшественников, что уж они-то не ошибутся, что у них все будет о'кей. Вот только форму для журналистов придумать... Вот и морщат лбы, сочиняют "законы о печати". И никаких уроков из истории... Ни давней, ни современной.

ІНІЦЫЯТЫВА

Гідраметцэнтр рэкамендуе

Рэспубліканскі гідраметэаралагічны цэнтр рэкамендуе беларускім сельгаспрадпрыемствам і грамадзянам перагледзець тэрміны сяўбы раслін і не пачынаць іх раней, нягледзячы на раннюю вясну.

Як зазначыў намеснік начальніка службы гідраметэаралагічных прагнозаў гэтай установы Дзмітрый Рабаў, са зменай клімату адбыліся "зрухі тэрмінаў наступлення веснавых працэсаў".

"Кліматычная вясна прыходзіць на тры тыдні раней, таму людзі імкнуцца правесці сяўбу культур як можна раней. Аднак гэта не зусім правільна. За апошнія гады ні адзін май не прайшоў без замаразкаў, а гэта якраз перыяд найбольш актыўнай вегетацыі сельскагаспадарчых раслін", — зазначыў ён.

У выніку, паводле слоў спецыяліста, шмат раслін гіне, дзяржава церпіць вялікія страты. *"Таму ў сувязі з глабальным пацяпленнем прынятыя цяпер тэрміны сяўбы сельскагаспадарчых раслін трэба пераглядаць"*, — зазначыў Д.Рабаў.

Наталля КАРОТКАЯ.

СДЕЛКА

«Красный Октябрь» продан

Частный производитель обуви СООО "Марко" приобретет витебскую фабрику "Красный Октябрь". Такое распоряжение содержится в президентском указе №324. Как сообщает БелаПАН, по завершению сделки "Марко" будет принадлежать 91% акций фабрики. Сумма сделки составит 180,746 млн рублей (84,8 млн долларов), то есть акции витебского предприятия будут проданы по номинальной стоимости — 30 рублей за акцию.

Как сообщил БелаПАН генеральный директор СООО "Марко" Николай Мартынов, объем производства обуви на ОАО "Красный Октябрь" к 2010 году планируется увеличить в 1,6 раза к уровню 2007 года при необходимом увеличении в 1,3 раза по условиям договора о продаже. В случае невыполнения условия по наращиванию объемов производства "Марко" будет обязано в течение 2011 года ежемесячно равными долями покрыть разницу между рыночной и номинальной стоимостью акций на дату их продажи.

Согласно указу, новому владельцу также необходимо до 2014 года рассчитаться с долгами приобретенного предприятия на сумму не менее 4,2 млн долларов. На 1 мая 2008 года задолженность "Красного Октября" по различным налогам составила 3,735 млрд рублей, пеня — 1,664 млрд рублей. Еще 3,657 млрд рублей задолженности приходится на кредиты, выданные фабрике "Беларусбанком" в 2004 году. Погашение задолженности будет производиться в рассрочку с 1 июня 2009 года по 31 июля 2014 года.

Решение о продаже предприятия инвестору согласуется с планами концерна "Беллегпром" о привлечении в отрасль частного капитала. В начале июня председатель концерна Эдуард Нарышкин заявил о готовности концерна продать инвесторам акции большинства госпредприятий отрасли. "Самым эффективным собственником может быть только частник, и в перспективе в отрасль легкой промышленности будет инвестировать не государство, а частный бизнес", — заявил он тогда, признав, правда, что не все предприятия концерна заинтересуют инвесторов.

Для "Марко" витебская фабрика может быть интересна, прежде всего, как площадка для расширения производственных мощностей. Этот вопрос руководство "Марко" рассматривало еще в 2002 году. Уже тогда "Марко" сделало первую попытку получить доступ к активам витебского предприятия. На базе "Красного Октября" планировалось создать белорусско-немецкое СП с участием немецкой фирмы "Эвимекс" и белорусской "Марко". Однако проект не получил развития.

Несколько раз руководство отрасли делало попытки самостоятельно вывести предприятие из системного кризиса: "Красному Октябрю" оказывалась господдержка в виде реструктуризации задолженности (график платежей предусматривал погашение проблемных кредитов к 2007 году) и отсрочек платежей по поставкам сырья. Но эти меры, как и большинство попыток оздоровить легпром, больших успехов не имели.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 ЧЭРВЕНЯ 2008 г.

НЕЗАЛЕЖНАЯ ЭКСПЕРТЫЗА

Дзе рэформы?

На працягу 2007 года не адбылося структурных рэформ (акцыяніравання, прыватызацыі, стварэння незалежнага рэгулюючага органа) у такіх сектарах беларускай эканомікі, як газавы, электраэнергетычны, тэлекамунікацыйны, а таксама на чыгуначным, аўтамабільным транспарце і ў дарожнай гаспадарцы.

Аб гэтым гаворыцца ў пятым Маніторынгу інфраструктуры Беларусі, падрыхтаваным даследчым цэнтрам Інстытута прадпрымальніцтва і менеджменту сумесна з Нямецкай эканамічнай групай у Беларусі. Яго прэзентацыя адбылася ў Мінску.

Эксперты адзначаюць, што нават двухразовае павелічэнне цэн на газ у 2007 годзе не прывяло да рэформ у сектары электраэнергетыкі. "Як і ў папярэднія гады, невялікія станоўчыя змяненні, напрыклад, поўная і своечасовая аплата электраэнергіі спажыўцамі, сталі следствам адміністрацыйных мер", — гаворыцца ў справаздачы. Канцэрн "Белэнерга" ліквідаваў пратэрмінаваную знешнюю запазычанасць, аднак унутры краіны захавалася значная пратэрмінаваная запазычанасць спажыўцоў. Акрамя таго, па-ранейшаму дзейнічае практыка льготных тарыфаў для асобных прамысловых спажыўцоў.

Не адзначана значных структурных пераўтварэнняў у газавым сектары. Тарыфы для насельніцтва на паслугі газазабеспячэння ў цэлым аказаліся ніжэйшымі за выдаткі газатранспартных арганізацый. Захаванне льготных цэн для асобных прамысловых спажыўцоў стварала праблемы для фінансавага сектара. На працягу года спажыванне аплачвалася поўнасцю, хоць даўгі папярэдніх гадоў не пагашаліся, што абмяжоўвала магчымыя інвестыцыі ў мадэрнізацыю актываў. Узмацненне адміністрацыйнага ўмяшання ва ўтварэнне тарыфаў, зніжэнне нацэнак прадпрыемстваў сектара і рост перакрыжаванага субсідзіравання выклікалі зніжэнне індэкса рэформаў, указваюць эксперты.

Не адбылося якіх-небудзь змяненняў на тэлекамунікацыйным рынку. РУП "Белтэлекам" заставалася манапалістам у аказанні большасці паслуг (за выключэннем мабільнай сувязі). Нягледзячы на высокую рэнтабельнасць арганізацый гэтага сектара, захаванне перакрыжаванага субсідзіравання ў сегменце фіксаванай тэлефаніі і льгот асобным катэгорыям грамадзян "не садзейнічае правядзенню рынкавых рэформ і не стымулюе далейшае развіццё сектара". Пры гэтым канкрэтных тэрмінаў акцыяніравання і прыватызацыі нацыянальнага аператара, а таксама планаў па стварэнні незалежнага рэгулюючага органа пакуль не існуе, падкрэсліваецца ў дакладзе.

Дзмітрый ЯРМАК.

Рабочие кадры выезжают за границу

В ближайшее время в стране будет "остро стоять вопрос рабочих кадров", заявил на заседании Республиканского совета директоров председатель "Белорусской научно-промышленной ассоциации" Николай Стрельцов.

Причина скорой нехватки трудовых рук более чем банальна: отток рабочих в соседние страны, где платят больше. В особенности это касается станочников, слесарей, электрогазосварщиков, рабочих других специальностей, на которых большой спрос за рубежом. "Наши люди начинают уезжать в Польшу, страны Балтии, Россию, где для таких работников представляют не только более высокую заработную плату, но и хороший социальный пакет. То же можно сказать и о руководителях различного уровня, инженерно-технических работниках", — цитирует Н.Стрельцова ПРАЙМ-ТАСС.

КОММЕНТАРИЙ

Что же происходит в стране с ценами?

По итогам января — мая индекс роста потребительских цен в Беларуси составил 106,6%. Тем самым нижняя планка годового прогноза по инфляции, которая определена на 2008 год в пределах 106—108%, успешно пройдена за 5 месяцев.

Проблема инфляции — это проблема не только правительства, но и каждого белоруса. Калейдоскоп изменений цен в гастрономах мало кого оставляет равнодушным. Глядя на протестующую, митингующую и бастующую Европу, невольно ловишь себя на некорректных мыслях: ну вы-то чего так рано замандражировали с вашими зарплатами, уровнем доходов, социальной защиты? Подумаешь, инфляция выросла на 2—3%! Да у нас бы этого просто не заметили.

Строго говоря, каждый человек может очень точно посчитать и свой собственный уровень инфляции, и уровень инфляции для своей семьи. Фактически мы это и делаем, ежедневно прикидывая и планируя предстоящие траты. Хотя эти подсчеты мало кто облекает в строгие цифры статистических индексов, от этого они не становятся менее важными, чем отчеты правительства. При этом они более объективны, чтобы понять, что же все-таки происходит в стране с ценами.

По данным Продовольственной и сельскохозяйственной организации (ФАО) ООН, среднестатистическая семья в Германии тратит сейчас на те же продукты питания, которых мировые инфляционные процессы коснулись в первую очередь, 10% своих доходов, французская — 16%, японская — 19%. В Китае эти расходы в среднем составляют 27%, в Бангладеш — 65%. Это только в среднем.

В Беларуси почему-то не принято публиковать такую статистику. Нам только остается надеяться, что те чиновники, которым доверено заниматься макроэкономикой и социальной защитой населения, владеют проблемой во всех ее аспектах, не уклоняются от неприятных сторон истины при подготовке решений правительства.

По итогам 2007 года, когда в России инфляция официально составила 11,9%, по крайней мере, прозвучало признание, что для подавляющего числа людей она вылилась в 20—25%. Теперь в России официально обуздание инфляции стало одной из важнейших задач нового руководства.

Инструментарий предлагается самый различный, в зависимости от позиции авторов. Но уже одно то, что объявлено о переносе сроков достижения равнодоходности продажи энергоносителей на внешнем и внутреннем рынках, возможном усилении социальной защиты малоимущих слоев населения от роста цен на продовольствие, говорит о серьезности проводимых и предлагаемых нашими соседями мер.

В Беларуси же не покидает ощущение, что в большинстве случаев наши министры, губернаторы, другие руководители обходят эти вопросы. До самого последнего времени официальное мнение было безапелляционным: прогноз по инфляции будет обеспечен. Вот только, как показывает практика, и официальное мнение бывает голословным.

Александр КРУГЛЕЕВСКИЙ,
www.ej.by

ХОТИТЕ ЗНАТЬ...

Зачем Беларуси еще один российский кредит?

Наша страна снова добивается российского кредита. Хотя один в размере 1,5 млрд долларов уже получила. При этом говорят, что экономика развивается стабильно. Тогда зачем еще один кредит? Об этом спрашивают читатели.

Белорусское правительство не расстается с идеей заполучить от России еще один стабилизационный кредит. На сей раз в размере 2 млрд долларов, чтобы компенсировать рост цен на газ.

"Есть официальное обращение белорусского правительства к российскому, и два Минфина сейчас изучают ситуацию", — заявил российский посол Александр Суриков на пресс-конференции в Минске. В частности, оцениваются такие показатели, как дефицит бюджета, сложности в экономиках, возможности возврата, условия выдачи.

Впрочем, дипломат дал понять, что оснований для выделения Беларуси денег пока маловато: в Беларуси экономическая ситуация достаточно спокойная, дефицита бюджета нет, а золотовалютные резервы страны "перевалили за 5 млрд долларов". Правда, он не исключил, что экономическая ситуация может измениться после повышения цены на газ, так что для белорусского правительства в этом вопросе не все потеряно. "Наша сторона никакого нежелания не выдать кредит не проявляла", — дипломатично отметил А.Суриков.

По мнению руководителя научно-исследовательского центра Мизеса Ярослава Романчука, для Беларуси выделение такого кредита — это решение краткосрочное и ошибочное. "Правительству нужно удерживать рост ВВП на уровне 10—11% в год. И других ресурсов, кроме российского кредита, у него фактически нет", — сказал он "Белорусским новостям". При этом чиновники не задумываются, что деньги придется потом отдавать, а также есть ли в них смысл в рамках нынешнего бюджета. "Они просто берут и берут. Логика простая: на всякий случай перестраховаться не помешает. Хотя на выходе мы получаем не только рост ВВП, но и инфляцию. Для Национального банка кредит также выгоден, поскольку позволяет сохранить стабильность на валютном рынке", — пояснил эксперт.

Внешние средства Беларуси действительно понадобятся, чтобы закрыть дырку внешней торговли. Дефицит платежного баланса Беларуси, который сейчас вырисовывается, потребует дополнительных 3—4 млрд долларов, отметил Я.Романчук.

Россия заинтересована выдать кредит не меньше, чем Беларусь его получить, считает эксперт. В этом случае Кремль снимает возможные

обвинения в свой адрес со стороны белорусского руководства за повышение цены на газ. Кроме того, в интересах России увеличивать зависимость официального Минска от себя. Чтобы потом этим воспользоваться при удобном случае, например, продаже госсобственности.

Напомним, в декабре 2007 года правительство Беларуси получило от России кредит в размере 1,5 млрд долларов на 15 лет под Libor плюс 0,75% годовых. Средства планировалось направить на финансирование ряда важнейших инвестиционных проектов. Вскоре после получения этого кредита Беларусь начала разговоры о выделении нового, в размере уже 2 млрд долларов.

Дмитрий ЕРМАК.

МНЕНИЕ

Проедаем

Совокупный внешний долг Беларуси на 1 апреля 2008 года составил 13 млрд 630 млн долларов США и вырос за первый квартал текущего года на 8% (на 1,007 млрд долларов США). Об этом свидетельствуют данные, обнародованные в статистическом отчете Национального банка Беларуси.

Как считает бывший глава Национального банка Станислав Богданкевич, такой рост совокупного внешнего долга пока вполне приемлем для Беларуси. "Другой вопрос в том, что за последний год этот долг практически удвоился. И беспокойство вызывает то, что значительная часть идет не на техническое перевооружение и новейшие технологии, а на проедание", — отметил он в интервью БелаПАН. С.Богданкевич обратил внимание на дефицит торгового баланса республики, который свидетельствует о том, что страна больше потребляет, чем производит и экспортирует. "Этот показатель очень плохой", — добавил экс-глава Нацбанка.

Его также беспокоит значительный рост внешней задолженности коммерческих банков. С.Богданкевич отметил, что в стране фактически отсутствует фондовый рынок и так сложилось, что все долги лежат на банковской системе. Это создает определенные риски для ликвидности системы, возвратности средств в случае проблем с погашением этих долгов. "Банковские долги — это ресурсы, которые выданы экономике. Если экономика начнет не возвращать заимствования, то это создаст серьезные проблемы для банковской системы, возникнут проблемы с ликвидностью и с валютным курсом", — пояснил Богданкевич.

Алексей ОРЕШКО.

Хто яны, стратэгічныя інвестары?

У якасці інвестараў ААТ "Палімір" разглядаюцца буйныя расійскія нафтавыя кампаніі. Пра гэта паведаміў намеснік старшыні канцэрна "Белнафтахім" Міхаіл Асіпенка.

Ён не назваў, якія менавіта кампаніі зацікаўлены ўкласці сродкі ў нафтахімічны комплекс, спасылаючыся на тое, што "заключаны пагадненні аб канфідэнцыяльнасці". Аднак зазначыў, што гэта "буйныя расійскія "вертыкальныя" нафтавыя кампаніі". "Паліміру" патрэбны стратэгічны інвестар, таму што сыравінай для вытворчасці прадукцыі з'яўляюцца нафтапрадукты", — сказаў ён.

Паводле слоў М.Асіпенкі, цяпер бізнес-план развіцця прадпрыемства праходзіць дзяржаўную экспертызу. Намеснік старшыні канцэрна праінфармаваў, што на стварэнне ў ААТ "Палімір" нафтахімічнага комплексу спатрэбіцца прыблізна 1,8 млрд долараў інвестыцый. Раней называлі суму ў 1,6 млрд долараў, падарожанне праекта звязана з павелічэннем кошту металу і адносным падзеннем курса долара да еўра.

М.Асіпенка праінфармаваў, што да канца 2008 года канцэрн "Белнафтахім" унясе ва ўрад прапанову аб продажы акцый прадпрыемстваў ААТ "Палімір" і ААТ "Нафтан". Цяпер, паводле яго слоў, вядзецца падрыхтоўка да аб'яднання гэтых суб'ектаў гаспадарання "для наступнага інвесціравання адзіным гаспадарчым комплексам".

"Палімір" заснаваны ў 1968 годзе, з'яўляецца адным з найбуйнейшых вытворцаў хімпрама Беларусі. Вырабляе поліэтылен высокага ціску, акрылавыя валокны, прадукты арганічнага сінтэзу і малатанажнай хіміі, тэкстыльна-дапаможныя рэчывы, вуглевадародныя фракцыі і тавары народнага спажывання. Больш за 60% прадукцыі экспартуецца ў Расію, Украіну, Германію, Фінляндыю, Польшчу, Іран, краіны Балтыі, Венгрыю, Балгарыю, Кітай і іншыя. Штогадовы знешнегандлёвы абарот складае прыблізна 200 млн долараў. Колькасць работнікаў — больш за 6000.

Наталля КАРОТКАЯ.

Новое месторождение нефти

О нем сообщили "Интерфаксу" в РУП "Белоруснефть".

"Месторождение нефти открыто в Хойникском районе", — сказали на предприятии. Общий запас нефти в новом месторождении по предварительным оценкам составляет около 150 тыс. тонн.

«Малых» стало больше?

По данным на 1 апреля 2008 года, в Беларуси насчитывалась 51 тыс. малых предприятий, передает БелаПАН. По сравнению с аналогичным периодом 2007 года их количество увеличилось на 36%, сообщает Министерство статистики и анализа. Рост числа малых предприятий, отмечает Минстат, обусловлен в основном перерегистрацией индивидуальных предпринимателей в юридические лица.

Объем внешней торговли товарами малых предприятий за январь—март 2008 года составил 2 млрд 244,5 млн долларов, в том числе экспорт — 464,9 млн долларов, импорт — 1 млрд 779,6 млн долларов.

Міні-завод па вырабе самагону

У Маларыцкім раёне Брэсцкай вобласці знішчана больш за дзве тоны брагі і падпольны міні-завод па вырабе самагону. Як паведамілі ў Маларыцкім раённым аддзеле ўнутраных спраў, выпуск самагону быў арганізаваны ў лясным масіве непадалёк ад вёскі Заор'е. Яго выявілі супрацоўнікі аддзела аховы правапарадку і прафілактыкі Першамайскага РУУС Мінска і Маларыцкага РАУС падчас правядзення сумесных мерапрыемстваў па барацьбе з самагонаварэннем.

Як зазначылі ў Маларыцкім РАУС, два месяцы таму ў гэтым жа рэгіёне была знішчана аналагічная вытворчасць, а таксама прыблізна дзве тоны брагі, летась — пяць такіх міні-заводаў.

Паводле інфармацыі УУС Брэсцкага аблвыканкама, усяго з пачатку 2008 года ў вобласці ліквідавана 57 падпольных вытворчасцяў, 111 тон самагону і самагоннай брагі.

Ларыса ШЫГАНАВА.

ЖЫЦЦЁ ЯК ЯНО ЁСЦЬ

Тыя льготы — нібы нябожчыку прыпаркі

Рабочыя і спецыялісты віцебскага панчошна-трыкатажнага ААТ "КІМ" зацікаўлена абмяркоўваюць чарговае распараджэнне А.Лукашэнкі — указ № 282, які скіраваны на тое, каб дапамагчы нашай лёгкай прамысловасці прарвацца ў лідэры эканомікі. Для гэтага, адпаведна ўказу, прадпрыемствы канцэрна "Беллегпрам" на перыяд з 2008-га па 2012 год атрымаюць шэраг фінансавых і падатковых ільгот, што мусіць спрыяць іх тэхнічнаму пераўзбраенню. А калі дакладней, то яны маюць атрымаць растэрміноўку на 3 гады па выплаце падатку на дабаўлены кошт пры ўвозе сыравіны і асобных тавараў для патрэб уласнай вытворчасці, а самі тавары вызваляюцца ад мытных пошлін.

Яшчэ прэзідэнт даў канцэрну "Беллегпрам" адтэрміноўку на колькі год па вяртанні дадатковай запазычанасці ў рэспубліканскі бюджэт і Фонд сацыяльнай абароны. Усе гэтыя захады, як давёў Лукашэнка, неабходныя, каб згаданы канцэрн "апрануў і абуў нашых людзей на сусветным узроўні".

У складзе "Беллегпрама" цяпер налічваюцца 4 буйныя прадпрыемствы з аналагічнай прадукцыяй — панчошна-шкарпэткавымі вырабамі. Самае старое — віцебская панчошна-трыкатажная фабрыка "КІМ", узведзеная больш як 70 год таму. Сёлета споўніцца роўна 60 год з таго часу, як прадпрыемства, разбуранае ў гады вайны з Германіяй, было зноў уведзена ў шэраг дзеючых. Абрэвіятура "КІМ" доўгі час, як напачатку, азначала "Камуністычны інтэрнацыянал моладзі", але ў перыяд перабудовы пачала разумецца як "Класіка індустрыі моды". Праўда, гэта — класічны прыклад таго, што ад змены назвы сутнасць не мяняецца, а праблемы не толькі не знікаюць, а робяцца яшчэ больш балючымі. Асабліва тыя, што пачалі паспяваць даўно.

Яшчэ на пачатку 90-х гадоў на фабрыцы былі заняты 6 тысяч працаўнікоў, а сёння — утрая менш. Тады, як і ў яшчэ ранейшыя, савецкія часы, "КІМ" сапраўды апрануў народ на велізарным абшары — ад Брэста да Камчаткі.

Цяпер збыту амаль няма. Нават у Беларусі. Тым больш не запатрабаваныя вырабы з маркай "КІМ" у Еўропе.

На думку віцебскіх пакупнікоў, прадукцыя кімаўцаў па спажывецкіх якасцях саступае вырабам Брэсцкага панчошна-трыкатажнага камбіната, калготкі якога больш эластычныя за віцебскія, а шкарпэткі не так пераціскаюць ногі і разлічаны не толькі на мужчын узору "метр з кепкай". Значна лепшым за віцебскі трыкатаж лічаць пакупнікі вырабы мінскай "Мілавіцы" і нават нядаўна ўзнікшага ў СЭЗ "Віцебск ААТ "Грацыя" — аднаго з групы — прыватных прадпрыемстваў "Імельда".

— "КІМ" не ў стане вырабляць канкурэнтаздольныя калготкі, — лічыць дасведчаны тэхнолаг панчошнай вытворчасці, якая пажадала застацца інкогніта. — Камбінат у Брэсце ўзводзіўся нашмат пазней за нашу фабрыку і там адразу было ўкаранёна самае прагрэсіўнае на той час абсталяванне. А наша, састарэлае, замянялася новым пакрысе і эпізадычна. Таму яно не паспявала за патрабаваннямі рынку. Яно і сёння ім не адпавядае.

— Вельмі сур'ёзнай праблемай, на думку субяседніцы, з'яўляецца дэфіцыт сучаснай сыравіны, — працягвае суразмоўца. — На такую ў нашага прадпрыемства няма грошай, але нават калі б яна была набытая, то на такім дапатопным абсталяванні, як у нас, працаваць з ёю немагчыма. І таму дасюль замест сучасных матэрыялаў мы ўжываем эластык. Калготкі з яго нікому не будуць падабацца, і я лічу, што ад іх вытворчасці нам трэба адмовіцца.

Там не менш мясцовы і нават рэспубліканскі гандаль замаўляе і рэалізуе віцебскія калготкі, бо яны танныя і сярод нашых жанчын знаходзяцца на іх пакупнікі.

Праўда, у калекцыі кімаўскай бялізны можна пабачыць прыстойныя мадэлі. Але ў агульным аб'ёме прадукцыі такіх вельмі мала. Тым часам увесь свет сёння прызнае толькі высокаэластычную бялізну з лайкрай, — распавядае тэхнолаг. — Найлепшую лайкру пастаўляе фірма "Дзюпон", але яна для нашай фабрыкі не па кішэні. Мы нават горшай і таннейшай лайкры фірмы "Байер" купляем абмежаваную колькасць: абы хапіла на ўзоры для оптавых кірмашоў і выстаў.

— Але самае, бадай, балючае месца на прадпрыемстве, — дадае суразмоўца, — старое фарбавальнае абсталяванне. Калі да нас прыязджаюць замежнікі, то ім паказваюць амаль усё, акрамя фарбавальнага цэху, бо ён варты хіба на тое, каб здымаць там фільмы жахаў. Гасцей вядуць на швейную вытворчасць, дзе працуюць на больш-менш сучасным абсталяванні, набытым за кошт аднаго з прэзідэнцкіх крэдытаў. І вось цяпер, адпаведна Указу №282, фабрыка будзе зноў браць крэдыт пад 5 працэнтаў гадавых. Я ўпэўнена, што гэтыя адміністрацыйныя захады не дапамогуць нам і астатнім прадпрыемствам канцэрна "Беллегпрам" падняцца на ногі. Мы ўжо неаднойчы атрымлівалі крэдыт і што? Гэтых грошай хапае на кароткі час, каб рыўком выскачыць у перадавікі, зрабіць справаздачу наверх аб дасягненні прагнозных паказчыкаў, а потым трэба вяртаць крэдыт, і атрымліваецца, што, узяўшы яго, фабрыка патрапіла ў кабалу. Шкада, але не ўсе гэта разумеюць своечасова.

Уратаваць вытворчасць за кошт спецыяльных ільгот і крэдытаў нельга. Каб рэаніміраваць такія прадпрыемствы, як наша, трэба не дапамагаць асобным з іх, і не галіне нават, а рашуча брацца за перабудову ўсёй сістэмы гаспадарання, каб яна была арыентавана не на даведзеныя з чыноўніцкіх кабінетаў прагнозныя паказчыкі, а на запатрабаванні рынку, інтарэсы пакупнікоў. І не беларускіх, для якіх важней за ўсё не мода і не якасць, а даступны кошт, а на больш патрабавальных. А мы задавальняемся менавіта найбольш памяркоўнымі спажыўцамі. Для нас, калі беларускі гандаль бярэ нашу прадукцыю, дык нічога лепшага нам і не трэба. Так мы нічога не зможам дамагчыся, і фабрыка наша паранейшаму будзе дыхаць на ладан, а ўсе гэтыя ўказы аб ільготах і крэдытах — як нябожчыку прыпаркі...

На такой вось песімістычнай ноце завяршылася наша гутарка з тэхнолагам, якая пажадала застацца не названай. Яе лёгка зразумець: шмат хто з тых спецыялістаў апынуліся за ягонымі варотамі, без працы і без сродкаў на існаванне. А маёй суразмоўцы няшмат засталося да пенсіі. І пра яе лёс у прэзідэнцкім указе аб падтрымцы лёгкай прамысловасці нічога не напісана...

Сяргей БУТКЕВІЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 ЧЭРВЕНЯ 2008 г.

РУБАМ!

Адкрыты ліст

дэпутату Палаты прадстаўнікоў ад Усходняй акругі №107 Уладзіміру Круку і дэпутату Мінскага гарсавета ад Мірашнічэнкаўскай акругі №45 Уладзіміру Галабурдзе

Падчас выбараў вы шмат абяцалі. Напрыклад, што будзеце адстойваць інтарэсы жыхароў нашага раёна. Перад завяршэннем дэпутацкага тэрміну вы, напэўна, плануеце сустрэцца з выбаршчыкамі, даць справаздачу, як баранілі іхныя правы. Прапаную вам адказаць на канкрэтныя пытанні, якія нас хвалююць. Можа, тады людзі прынамсі запомняць вас, бо сёння яны нават не ведаюць вашых імёнаў.

1.Адкажыце, калі ласка, на шматлікія пытанні жыхароў дамоў №20 па вул.Гамарніка і №10 па вул.Мірашнічэнкі (разам 900 кватэр), на дзіцячай пляцоўцы якіх вядомае вам ААТ "Карповіч" збіраецца будаваць 12-павярховы дом.

Жыхары кажуць, што ў генеральным горадабудаўнічым плане гэты будынак не прадугледжаны. Што ён перакрые доступ свежага паветра ў калодзежападобны двор. Што сонечнае святло не патрапіць з адзінага сёння паўднёвага прасвету на дзіцячы садок санаторнага тыпу №406 для хворых дзяцей. Што перакрыецца роўны праход для пажылых жыхароў, што заезд у паркінг без натуральнай вентыляцыі прывядзе да невыноснай загазаванасці двара. Што раней, у 1992 годзе, Мінгарвыканкам ужо прызнаваў будаўніцтва немагчымым (праўда, тады былі дэпутаты ад БНФ).

Сотні жыхароў збіраюцца на сходы, сотні подпісаў пад адпаведнымі зваротамі. Паводле заканадаўства і Орхускай канвенцыі, у такіх выпадках меркаванне жыхароў павінна быць вырашальным. Але тэхніка фірмы "Інсэрвісбуд" за некалькі гадзін развараціла збудаваную жыхарамі дзіцячую пляцоўку ды паставіла глухую агароджу. Так спяшаюцца, што не маюць часу на ўзгадненне з гарадскімі службамі: 31 мая пашкодзілі падземныя цеплатрасу і электрычны кабель.

Чаму забудоўца і раённая адміністрацыя хаваюць ад жыхароў праектна-каштарысную дакументацыю на наваяўленую будоўлю? Яна ж не сакрэтная! Не паказваюць заключэнне Цэнтра гігіены і эпідэміялогіі, дазвол на будаўніцтва ды шмат іншых дакументаў.

Як сталася, што тут толькі што аднавілі камунікацыі — за бюджэтныя грошы (спецыялісты ведаюць, што на гэтым прыватны забудоўца "эканоміць" да 40% выдаткаў)? Ці маюць падставу здагадкі, што дом з двухпавярховымі кватэрамі ды падземным паркінгам фармальна не мае "павышанай камфортнасці", бо тады ўчастак пад забудову даюць без аўкцыёну?

Хто тыя таямнічыя ЯНЫ, пра якіх кажуць жыхарам чыноўнікі ("вы не ведаеце, на КАГО замахнуліся")? Чаму паводзіны новых забудоўцаў у Мінску сталі нагадваць стыль расійскіх зямельных захопнікаў-рэйдэраў? І гэта далёка не ўсе пытанні да вас у сувязі з новабудоўлямі "Зялёнага Лугу".

2. Патлумачце, хто тыя людзі, якім дазволена будаваць унушальныя дамы каля самага Цнянскага вадасховішча. Хто памяняў пад патрэбы гэтых, напэўна, дужа важных для Беларусі людзей генеральны план, нічога не зрабіўшы для простых жыхароў былой вёскі Цнянка, якія даўно просяць зрабіць асветленую дарогу праз лес для дзяцей у школы на вул.Мірашнічэнкі?

3. Раскажыце, як і на чыю карысць будзе адбывацца высяленне спрадвечных жыхароў Сельгаспасёлка? Людзі сваім потам і крывёю пасля вайны там будаваліся, ім не дазволілі прыватызавацца, а цяпер іх выкінуць без зямельнай кампенсацыі? Каму будуць прададзены ўчасткі і ў чыю кішэню пойдзе цана зямлі?

4. Развейце, калі ласка, сумневы жыхароў Савецкага раёна наконт будучыні знакамітых артэзіянскіх водазабораў, якія забяспечваюць добрую якасць вады для паловы сталіцы. У чыіх інтарэсах насуперак генплану і геалагічнай экспертызе на ваданосных пластах у раёне вул.Някрасава плануецца знос малых будынкаў і пабудова хмарачосаў? Што будзе пасля гэтага з нашай вадой?

Я быў бы рады, каб адказы былі дадзены публічна. Бо яны хвалююць дзесяткі тысяч жыхароў нашага раёна — і не толькі. Калі ж вы не здолееце адказаць — значыць, падзяляеце адказнасць за факты, выкладзеныя вышэй.

Вінцук ВЯЧОРКА,
першы намеснік старшыні Партыі БНФ,
жыхар "Зялёнага Лугу".

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

Якія прыкметы сапраўдных еўра?

Раней неяк мы адкладвалі грошы і на "чорны дзень" куплялі долары, але зараз усе раяць пераходзіць на еўра. Але для нас — гэта зусім новыя грошы. Раскажыце, калі ласка, якія прыкметы сапраўдных банкнот еўра?

П.Матусевіч,
г.Вілейка.

Першая парада, якую мы можам вам даць, не купляйце грошы з рук, у беларускіх банках ужо добра ведаюць еўра, таму аператары наўрад ці памыляцца. Але, на ўсялякі выпадак, усё ж такі нагадаем, як самому высветліць сапраўднасць еўра.

Па-першае, навобмацак вы павінны адчуць пад пальцамі "выпуклы" шрыфт, які атрымліваецца ў выніку спецыяльнага нанясення літар пры друку і адчувальны пры дакрананні.

Другая парада спецыялістаў. Прыглядзіцеся ўважліва да банкноты, падняўшы яе на прасвет: вадзяныя знакі, ахоўная нітка і празрыстая палоска робяцца заўважнымі. Названыя тры прызнакі можна ўбачыць як з франтальнага, так і з адваротнага боку арыгінальных банкнот.

Трэцяе: сагніце банкноту — з франтальнага боку з'явіцца зменлівая выява на галаграфічнай палосцы (на банкнотах невялікага наміналу) ці на галаграфічнай пляме (на банкнотах вялікага наміналу).

І нарэшце, на адваротным баку пры згінанні можна ўбачыць пералівістую палоску (на банкнотах невялікага наміналу) ці фарбу, якая змяняе колер (на банкнотах вялікага наміналу).

МНЕНИЕ

Заложница политики власти

5 июня первый замглавы президентской Администрации Анатолий Рубинов заявил, что с нового учебного года белорусская школа снова станет 11-летней. В ближайшее время соответствующий декрет об отмене 12-летки должен подписать глава государства. Может быть, документ увидит свет, когда этот номер "Народной воли" дойдет до читателей. Но это не принципиально, важно иное.

Удивительно и возмутительно, с какой легкостью и беспечностью руководство страны отрекается от школьной реформы на ее завершающем этапе. Хотя этого нельзя было допустить по известным простым причинам.

Стремительно развивающаяся цивилизация накапливает все новые знания во всех сферах человеческой жизни. Следовательно, увеличивается объем содержания образования, который невозможно уложить в прежние программы учебных дисциплин с 11-летним сроком обучения. Когда-то нам хватало и десятилетки для усвоения "учебников, которые были тоще нынешних на целое полстолетие". К тому же не изучались многие дисциплины, считалось, что нет надобности в иностранных языках, в познании хотя бы азов "буржуазных лженаук" (генетики, кибернетики, информатики и др.). Сейчас изменились не только объемы, но и приоритеты компонентов содержания образования, что, конечно же, требует дополнительного времени обучения школьников.

Целесообразность 12-летнего среднего образования диктуется и заботой общества о здоровье молодого поколения. Школьники крайне перегружены, ведь настоящая учеба — это огромный труд для растущего организма. Статистика детских медицинских учреждений, результаты призывных комиссий военкоматов плачевны. Требуется глобальная государственная программа оздоровления детей, начиная с повышения качества жизни семей и заканчивая разгрузкой школьников. Последнее непременно ведет к увеличению срока обучения.

Предложенное Лукашенко действительно необходимое введение 5-дневки в режим работы школы в старших классах за 8 лет обучения фактически уменьшит учебное время на 240 учебных дней, то есть почти на целый учебный год. Значит, при переходе на 11-летний срок обучения в условиях пятидневки школа по своим общеобразовательным возможностям окажется на уровне десятилетки со всеми вытекающими из этого негативными последствиями.

Общественно необходимый и индивидуально желаемый объем содержания среднего образования в условиях 5-дневки можно реализовать только за 12-летний курс обучения.

Во всех развитых странах мира это давно делается. Даже в воюющем Афганистане, где вместе с мужем мне пришлось побывать, среднее образование дети в Кабуле получали в 12-летней школе.

Разумной альтернативы школьной реформе нет. Нелепым выглядят мотивы и аргументы ее оппонентов. А поспешность, некомпетентность, бесцеремонная напористость в решении судьбы школы напоминает разве что действия слонов в посудной лавке.

Почему-то вдруг руководство страны спохватилось, ощутив избыток образования и неоправданную трату средств на него. Неосмотрительными и негуманными являются доводы Администрации президента, направленные на приостановку реформы с целью сокращения государственных расходов и снижения конкурентоспособности отечественного образования. В цивилизованном обществе образования, как и благодарности, никогда не бывает излишек, а экономисты давно знают, что самое выгодное капиталовложение — в образование. Это доказал опыт Японии, где всеобщее среднее образование было введено еще в 1936 году.

Неубедительной является и ссылка на социологические исследования. Можно подумать, что власть прислушивается к мнению родителей... Чего ж она не изучала мнение пенсионеров? Махом отменила мизерные льготы, в том числе и школьникам на проезд, как непозволительную роскошь и милостливо советует им привыкать. Без всяких социсследований широкое использование репетиторских услуг говорит о массовом стремлении родителей дать своим детям качественное образование. А то, что определенная часть родителей не видит необходимости в 12-летней школе, это скорее всего потому, что некоторые респонденты в материальной и духовной нищете теряют способность видеть любую цель — "живут, как набежит", другие — предпочитают видеть дно воспетой чарки. В мою юность, помню, вернувшиеся с войны инвалиды, вдовы продавали кормилиц — коров, свиней, чтобы выучить детей. А сейчас, видите ли, власти сочувствуют родителям, что увеличивается материальная нагрузка на семьи по содержанию двенадцатиклассника.

Удивление вызывают аргументы Национальной академии наук в лице ее руководителя, который в период перехода к новому этапу инновационного, интенсивного развития на основе внедрения наукоемких, ресурсосберегающих, экологозащитных технологий почему-то видит основную задачу школы в подготовке рабочих рук. Экий судьбоносный научный вывод, спасительный для экономики страны!

И уж совершенно бестактным звучит нынче муссирующийся мотив, что 18-летним учащимся нечего делать в школе, им надо заниматься продолжением рода человеческого. Школьники недоумевают, родители горько усмехаются.

Единственно обоснованными являются замечания по корректировке программ учебных дисциплин. Известно, что этот процесс перманентный и его нужно вести, перестраиваясь на марше. Есть уже много хороших малоемких, доступных учебников (физика, химия для 7-х, 8-х классов), чего не скажешь о гуманитарных дисциплинах. Разве это нормально, когда выпускники школ не владеют разговорной белорусской речью, не знают историю и культуру своей страны?! И в это время решено снять историю Беларуси как учебный предмет. Да это же святотатство!

Без научных знаний на разных пропагандистских акциях, бутафорской "линии Сталина" не воспитаешь гражданина, патриота! Корректируя программы, нельзя допустить снижения общеобразовательного уровня. Эта работа, как показала практика, по плечу специалистам научных центров Министерства образования. К сожалению, в последний год оно было больше озабочено спешным созданием организации "Белая Русь", чем своими профессиональными делами. Надо же было в школах и детсадах почти всех педработников заставить вступить в эту организацию, собрать с них по 17.500 рублей членских взносов.

В школе учителя перегружены разного рода писаниной, хозяйственной работой, сбором денег с детей на принудительную подписку, многочисленные лотереи, нередко работают на показуху. В Октябрьский район нашего города в марте приезжали педагоги из стран Балтии. Для того чтобы "показать, как мы в Беларуси работаем", в школу неделю завозили и неделю вывозили дорогостоящее техническое оборудование из областного госинститута повышения квалификации и переподготовки руководящих работников и специалистов образования. Прибалты были поражены техническим оснащением белорусских школ. Очковтирательство, ложь вышли на международный уровень. А газета "Витьбичи" возвела этот наглый обман в статус достижения и примера для подражания. В школах идет деморализация кадров, но контрактная система держит их в повиновении, бесправии; большинство из них испытывают депрессию и безысходность, вошли во внутреннюю эмиграцию.

Позиция государства легкомысленна. Сутью своей деятельности власть должна культивировать и пропагандировать образование, но этим себя не утруждает большинство ее представителей. Вспомните хотя бы грамотея Дементея, современного "богослова и лингвиста" из Бреста Сумара. Лишь некоторые руководители владеют грамотной речью. Многие же не могут даже согласовывать члены предложения, склонять числительные, демонстрируют незнания понятийного аппарата и соответствующей терминологии — все это тяжко восполнимые пробелы школьного образования. А ведь скудость речи — это скудость мышления. А чего стоят опрометчивые заявления руководителей: "книжек не читаю", "вырос на стихах Быкова" и другие, порочащие образовательный имидж власти.

Власть показала полную неспособность управлять процессом образования. Коль государство программировало реформу, то его руководители должны нести персональную ответственность за провал избранного курса. Закон о 12-летней школе принимали не Шушкевич с Позьняком, а нынешний парламент, и подписывал его президент. На реализацию реформы за 10 лет растрачены огромные средства, не меньше будет стоить ее демонтаж, а около 30 тысяч учителей-аутсайдеров обречены на незанятость (почти целый город). Снижение на 2 часа учительской недельной нагрузки не спасет их, тем более не улучшит материальное положение учителей.

Кто виноват в приостановлении реформы? Даже обычно ретивый глава государства не называет виновных. Ответ однозначен — власть.

Школа стала заложницей резкого ухудшения социально-экономической ситуации в стране. Государство, сбрасывая со своих плеч социальную ношу путем обрезания гарантий и льгот, сейчас посягает на качество образования подрастающего поколения. Этим в ближайшей перспективе будет нанесен огромный ущерб интеллектуальному потенциалу страны, дальнейшему развитию производительных сил. Тогда жизнь заставит провести реформу образования в полном объеме.

Роза МЕЛЬНИКОВА,
пенсионерка,
педагогический стаж 40 лет.

г.Витебск.

СИТУАЦИЯ

Хвалить хвалили, а на работу не берут

Мне сорок восемь лет, я казах, но живу и работаю долгие годы в Беларуси. Здесь учился в Гродненском сельхозинституте, получил специальность зооинженера. Защитил кандидатскую диссертацию, имею звание доцента по специальности "экономика". Плюс к тому закончил еще и Гродненский государственный университет имени Я.Купалы с дипломом юриста.

Работал вначале в родном сельхозинституте, а в последние годы (с сентября 2005-го) был доцентом кафедры управления и экономики ГрГУ имени Я.Купалы. Зарабатывал не так уж и мало - до полутора миллиона рублей, что было очень кстати: у меня ведь семья, двое сыновей-подростков.

Однако в последнее время ситуация стала меняться - со стороны руководства я все больше чувствовал неприязненное отношение к себе, и зарплата моя упала до 300--400 тысяч рублей. С 1 июля я ухожу из ГрГУ имени Я.Купалы и становлюсь безработным.

Возможно, что в своей преподавательской работе я допускал какие-то промахи, в чем меня упрекнули в ректорате вуза, и посоветовав вернуться в Аграрный университет (бывший сельхозинститут). Интересно, что ректор этого учебного заведения В.Пестис — член Совета Республики Национального Собрания (кстати, мой бывший научный руководитель при подготовке и защите кандидатской диссертации) в разговоре по телефону с нашим "губернатором" В.Савченко, к которому я обратился за помощью, даже расхваливал меня. Но почему-то когда я, обнадеженный, пришел по поводу будущей работы в Аграрный университет, то услышал, что, мол, коллектив против моего возращения...

Вот я и теряюсь в догадках: в чем дело? Может, я и вправду никуда не годный специалист? Тогда зачем хвалили? Или мои знания и опыт, научный и преподавательский потенциал никому не нужны?

А может, дело в ином: около десяти лет я был активистом демократического движения, состоял в БНФ. Потом... потом отошел от общественных дел. Захотелось тихой, спокойной жизни - вот и получил "покой". Теперь жалею о своем малодушии. И, как бы ни сложилось с дальнейшим трудоустройством, жизнь толкает к тому, чтобы вернуться к активной гражданской позиции, преодолев иллюзию "абы тихо".

Рахметолла Рахимжанович БАЙТАСОВ,
кандидат сельскохозяйственных наук.

Гродно.

ОТ РЕДАКЦИИ

Публикуя исповедь Р.Байтасова, мы готовы услышать мнение и другой стороны. Возможно, у руководителей Гродненского государственного университета имени Я.Купалы и Аграрного университета, с которыми у кандидата сельскохозяйственных наук Рахметоллы Байтасова "не сложились отношения", есть своя версия на этот счет? Милости просим высказаться по затронутой теме.

НОВЫЯ ВЕРШЫ

Яўген ГУЧОК

Зямля і неба

***

А зямля, відаць, — гэта дно,
Куды мы з нябёс упалі,
І нас ад сябе не адштурхнула яно,
Каб вярнуцца назад нам
І працягваць далей
Наш Боскі нябесны шлях...

Ах!
Зямля, відаць, — гэта дно,
І мы з гэтым дном — заадно...
Апроч як зямнога кіно
І зямнога хлеба
Нічога нам болей не трэба...

Вось тут і разгадка,
Вось тут сакрэт,
Што кожны амаль —
Земляед-караед.

***

З-пад горада выграблі
Процьму зямлі
І звезлі кудысьці яе
У балота,
А потым ў тунелях
Вагоны пайшлі —
Павезлі людзей
На гульню, на работу.

Я з горадам часта
Адзін на адзін —
І вось жа тады
Мы ўдваіх у маркоце,
Бо памяць стагоддзяў,
Гадоў і гадзін
Па волі людской
Дзесь гібее ў балоце.

***

Яблыкі-паданкі
Й людзі-падонкі...
Не параўнальны яны
Ва ўсім:
З паданак робяць
Віно, самагонку,
Мы і жывёлы
Яблыкі тыя ядзім;

Людзі ж падонкі
Уверх ірвуцца,
Нашу Айчыну
Каб знішчыць ушчэнт...
Не абцяжарвае іх
І Канстытуцыя:
Кожны з іх — д'ябла
Адданы агент.

***

Усе колеры святлафору
На кожнай валюце жывуць,
І людзі на іх без разбору
Адначасова і разам пруць.

***

Што ордэн Скарыны
Табе не далі, —
Не дзіва,
І бедаваць не трэба;
Ты Творцу падзякуй,
Што у цябе ж яны
Не забралі
Скарынку апошнюю хлеба.

Дано мне тело...
(Восіп Мандэльштам)

Мне цела дадзена дзеля таго,
Каб адчуваў душой я вецер,
Ў якім лунае, да ўсяго,
Сцяг бел-чырвона-белы —
найпрыгожшы ў свеце.

Мне цела дадзена дзеля таго,
Каб у залітых сонцам гонях
Душа мая, апроч ўсяго,
Шчэ любавалася б Пагоняй.

Мне цела дадзена, як вам,
Каб праз яго душа спявала
І каб Магутны Божа сам
Нас слухаў і прымаў з ухвалай.

ВАС ЦІКАВІЦЬ

Чаму зорак дванаццаць?

Наколькі вядома, колькасць зорак на сцягу Злучаных Штатаў Амерыкі адпавядае колькасці штатаў у ЗША. А ці адпавядае колькасць зорак на сцягу Еўрасаюза колькасці краін, якія ў яго ўваходзяць? І яшчэ адно пытанне: ці ёсць у Еўрасаюза герб?

Вадзім Піцулевіч, г.Віцебск.

Колькасць зорак на Еўрапейскім сцягу заўсёды заставалася адной і той жа — дванаццаць. Узор сцяга быў зацверджаны еўрапейскай супольнасцю ў 1986 годзе, хаця гэты самы сцяг выкарыстоўваўся, каб прадстаўляць "Еўропу" іншай арганізацыяй — Саветам Еўропы з 1956 года. Было вырашана, што зорак будзе дванаццаць як сімвал дасканаласці: існуе дванаццаць апосталаў, дванаццаць гадзін днём і г.д. Колеры блакітны і залаты былі колерамі графа Рычарда Кудзенхова Калергі, які ўпершыню выказаў ідэю стварэння агульнаеўрапейскага саюза ў 1923 годзе.

НЕСМЕШНОЙ ФЕЛЬЕТОН

Укротитель ос

Еще полвека назад в армейских кругах шутили: дескать, дослужился до майора, голова не нужна — другие за старшего офицера будут думать. Этот давний анекдот вспомнился вот почему. Мой сосед по садоводческому кооперативу (назовем его Дмитрием Миронычем) в свои 47 лет в звании подполковника милиции ушел на пенсию. На гражданке некоторое время трудился сторожем. Почти к миллионной пенсии имел неплохой приработок. Одним словом, жил не тужил. Кстати, бывший блюститель порядка не прекращал бражничать, как и в годы, когда был при погонах и больших звездах...

Садовод и огородник из него оказался никудышный. Оно и понятно, из-за чарочки хмельной не до секатора и лопаты. Поэтому супруга Ирина постоянно "пилила" его за безделье. Однажды все же настояла, чтобы Мироныч под крышей дачного домика прибил доску, которая могла упасть на голову...

Приставив лестницу, Дмитрий попытался вколотить гвоздь. Только взмахнул молотком, как вокруг головы закружились осы. Одна даже вонзила жало ему в лоб. Дачник бросил орудие труда и скоренько скрылся подальше от кусачих тварей. Отсидевшись под тенистой яблоней, первым делом "замочил" попытку отремонтировать фазенду.

Затем подался к председателю садоводческого кооператива Валентине Березкиной. Долго объяснял причину визита. Женщина поняла, что к чему, ехидно захихикала, приговаривая: "Соберем денег и вызовем МЧС. Пусть спасатели ликвидируют опасный для вас очаг".

Дачник-неудачник спьяну не уловил юморной подоплеки в словах Березкиной и все лето ждал помощи от "эмчеэсников". Естественно, не дождался, зато вольготно отдохнул на лоне природы. Однако женушка не давала покоя, напоминая о незавершенной работе. Дмитрий в свою очередь вертел возле виска пальцем, похоже, намекал, что только дурак рискнет приблизиться к осам...

Весь летний период Мироныч не просыхал. Наконец-то наступила осень, и огородник решился-таки на очередную попытку укротить "квартирантов". Вооружившись метлой, пнул в гнездо изо всей силы, а сам сиганул в дом: как бы чего не вышло. Ведь когда-то ужаленный лоб напоминал о жутком событии. Выглянул в окошко: осы не летают. Обрадовался пенсионер своей сноровке и пошел хвастаться соседям-огородникам: мол, подвиг совершил во имя жены. После каждого визита было застолье с горячительным и неумолкающее повествование об укрощении ос. На иные речи не хватало запаса слов.

К сожалению, доска под крышей так и осталась неприбитой. Вскоре начались заморозки. Казалось бы, никакого препятствия, чтобы прибить злосчастную доску, уже нет. Вновь Мироныч прислонил к стене лестницу. Добрался почти до верхотуры, и вдруг случилось непредвиденное: лестница ушла из-под ног. Грохнулся Мироныч о мерзлую землю, аж искры из глаз посыпались. Еле поднялся, почесывая затылок. Оказывается, основание лестницы скользнуло по гололеду, и дачник приземлился на копчик с четырехметровой высоты. Такое падение также не обошлось без очередной "замочки", которая длилась около двух месяцев. Затем пьянство продолжалось с соседями по витебской квартире. И каждый раз, опрокидывая в горло спиртное, Дмитрий Мироныч вслух вспоминал о проклятых осах. Собутыльникам даже надоело слушать одно и то же. Как-то один из них возьми да и спроси: "Мироныч, как тебе с таким интеллектом удалось дослужиться до подполковника, если ума не хватило справиться с осами и застраховать стремянку?"

На что сотрапезник гордо ответил: "До капитанского чина помню всё. А затем — провал памяти. Однако кое-какие эпизоды вспоминаются. Несанкционированные пикеты, митинги разгонял и составлял протоколы на бунтарей. Главное — было и есть, за что выпить, закусить. Чем не житуха?! За своего кумира укротим любого, а надо — горло перегрызем".

Выходит, анекдот пятидесятилетней давности — не в бровь, а в глаз — актуален и поныне.

Владимир ЖИГУЛОВ.

Витебск.

Народная Воля http://www.nv-online.info
27 ЧЭРВЕНЯ 2008 г.

События в мире: европейский взгляд

Французский поцелуй

Николя Саркози предложил НАТО брак по расчету

Президент Николя Саркози представлял в Париже новую военную доктрину Франции ("Белая книга"). Три тысячи офицеров и приглашенная пресса ловили каждое его слово. Еще бы: французские ВС не реформировались с 1994 года. Вкратце доктрина сводится к следующему: французская армия станет меньше, "умнее", технологичнее и таким образом сможет лучше противостоять мировому терроризму.

Но реформа армии в выступлении Саркози была не главным, хотя и важным элементом. Президент заявил, что не видит препятствий к тому, чтобы Франция вернулась в военную структуру НАТО, иными словами — под командование альянса. Правда, с существенными оговорками. И само заявление, и масштаб оговорок претендуют на широкий международный резонанс.

Немного истории. Президент Шарль де Голль в 1966 году отказался передавать французскую армию под контроль НАТО и запретил размещать на территории Франции военные базы НАТО. Причин было несколько: во-первых, нежелание находиться под контролем союзников; во-вторых, Франция, ранее оккупированная Германией, стремилась подчеркнуть свою независимость. В итоге страна вышла из Комитета военного планирования и Группы ядерного планирования альянса.

Сейчас обстановка в мире другая. "Терроризм повсюду: он здесь и сейчас", — заявил Николя Саркози и развил иранскую тему, ставшую весьма актуальной в Европе во время прощального турне Джорджа Буша на минувшей неделе.

По словам Саркози, самой опасной и непосредственной угрозой для всей прогрессивной общественности является Иран и его атомная программа. Не исключено, что иранцы намереваются обогащать уран именно для производства ядерного оружия. "Сегодня кризис вокруг Ирана — это угроза номер один всему миру. Вместе с нашими партнерами мы сделаем все, чтобы его разрешить", — подчеркнул президент Франции.

Из-за террористической угрозы Франция может вновь присоединиться к военной структуре НАТО. Но взамен Саркози требует полной свободы в принятии решений об отправке французских войск в зоны конфликтов. Ядерный арсенал Франции также остается под контролем Парижа. А в мирное время французские ВС вообще выводятся из-под командования НАТО. "Франция — независимый союзник. Свободный партнер", — заявил президент республики.

Обозреватель "Ассошиэйтед Пресс" тут же окрестил условия Саркози "камнем в огород НАТО" и выразил недоумение по поводу амбиций французского лидера. Тем более Саркози помимо всего прочего заявил, что видит будущее Североатлантического альянса более "европейским".

"Саркози, неоднократно выступавший после победы на президентских выборах в мае 2007 года за улучшение отношений с США, настаивает, что повышение роли Франции в НАТО нисколько не ущемляет интересы всего ЕС по вопросам обороны", — пишет "Ассошиэйтед Пресс".

Генсек НАТО Яап де Хооп Схеффер официально одобрил намерения Франции возобновить военное сотрудничество с альянсом. Одобрил сухо, через представителя. Видимо, требование Франции оставить в своем распоряжении национальную армию и ядерное оружие восторгов в аппарате НАТО не вызвало.

